Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 10 (509). Вільня, Нядзеля 5 Сакавіка 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Браніслаў Тарашкевіч.

Тарашкевіч усьцяж судзіцца з Польшчай. Вось і 24.II.33 г. адбыўся яго суд у Віленскай Апэляцыі. З гэтай нагоды прыпомнім, хоць коратка, аб ягоных падзеях і зробім з іх некаторыя высновы.

Тарашкевіч паходзіць з беларускай каталіцкай сялянскай сям'і з-пад Лаварышак, Віленскага пав. Гадоў мае 42. Будучы вучнем аднэй з расейскіх гімназіяў у Вільні (1908—1911) належыў да тайнай польскай арганізацыі „Wyzwolenie". Быў ён тады Беларусам польскай культуры і ўважаў, што барацьба за вольную Польшч вядзе так-жа да вольнасьці і Беларусь. Пазьней (1912—1917), будучы студэнтам Петраградскага ўнівэрсытэту, Тарашкевіч трымаўся падобных палітычных пагляд аў. Падчас завярухі рэвалюцыйнай і ваеннай, а так-жа пару гадоў пасьля Рыскага Трактату (1918—1923), Тарашкевіч прымае чынны ўдзел у беларускім палітычным жыцьці і ведамы, як старонньнік польскай ор'ентацыі.

У 1923-4 г. Тарашкевіч ад польскай ор'ентацыі аць веразеў і пачаў ор'ентавацца на Савецкую Расею. Цяпер ён пачаў думаць, што апора Беларусі аб Саветы давядзе Беларускі народ да вызваленьня. З дэмакрата Тарашкевіч стаўся фактычна свайго роду камуністым. Але, як падчас польскіх сваіх сымпатыяў, так і падчас савецкіх, Тарашкевіч заўсёды стаяў на грунце самадзельным беларускім і ніколі ня быў падпарадкаваным аднаму ці другому палітычнаму кірунку.

У 1924 г. Тарашкевіч становіцца на чале „Грамады". Паўстае вялікі народна-грамадзкі беларускі рух. Камуністы пасылаюць у „Грамаду" сваіх агентаў, якія беларускаму грамадаўскаму руху часта прыдаюць характар камуністычны і ўрэшце даводзяць да арыштаў. Сяньня сярод беларускіх палітыкаў можна нават спаткаць думку, што камуністы (за плячамі Тарашкевіча і без яго ведама), праз сваіх агентаў, сьпярша усімі сіламі памагалі развою „Грамады", спадзяючыся мець з яе паслушную службу ў сваіх руках, а пасьля, калі гэта ім не ўдавалася, яўна пачалі ёй надаваць камуністычны характар, каб яе аканчальна скомпрамітаваць у вачах польскіх уладаў і выклікаць яе ліквідацыю.

14.I.1927 г. Тарашкевіч, разам з іншымі павадырамі „Грамады", арыштаваны. 22.V.1928 г. у Віленскім Акружным Судзе дастае ён 12 гадоў цяжкога вастрогу. Апэляцыя 16.IV.1929 г. кару гэту з 12 г. скарочвае на 6. г.Вясной 1930 г. Тарашкевіча (і іншых), без яго просьбы, з турмы звальняюць. Сталася гэта дзякуючы захадам польска-беларускай санацыі, якая думала Тарашкевіча прыгалубіць узноў да польскай ор'ентацыі. Гэта аднак ім не ўдалося. Тарашкевіч пад восень таго-ж 1930 г. ўцякае ў Гданск. 6.II.1931 г., пры пераездзе з Гданску ў Рыгу праз польскі калідор пад чужым пашпартам, Тарашкевіч быў польскімі ўладамі арыштаваны ўзноў. Была яму зроблена новая справа, за якую ў Віленскім Акр. Судзе 29.XI.32 г. ён атрымаў 8 гадоў цяжкога вастрогу. Апэляцыя кару гэту 24.II.33 г. пацьвердзіла.

Польскія ўлады Тарашкевічу за ўсе гэтыя яго дзеі прыпісвалі змову з бальшавікамі, каб адарваць Зах. Беларусь ад Польшчы і далучыць яе да Саветаў. Тарашкевіч-жа заўсёды даказваў, што ён, хоць праканаными не зблізіўся ніякім падпарадкаваньнем, але ад маскоўскага камуністычнага інтэрнацыяналу не залежыць, у змове з імі не знаходзіцца і працуе сапраўды дзеля грамадзка-гаспадарчага вызваленьня беларускага народу. Падчас „Грамады" суд у гэтым ня даў яму веры,а 29.XI.32г. і 24.II.33г. згадзіўся з Тарашкевічам, што ён не які камуністычны агент, а незалежны беларускі радыкальны рэвалюцыянэр.

Такім чынам, пасьля стольких гадоў палітычнага хістаньня і пасьля стольких гадоў вастрожнай няволі, Тарашкевіч урэшце з мутных хваль, якія яго, здавалася, ўжо залівалі, выплыў урэшце на чыстыя, шырокія і глыбокія воды незалежнай ідэовай барацьбы за самастойнасьць Беларускага Народу. Палітычна такім чынам Тарашкевіч цяпер зразумелы. Астаецца аднак ён далей цьмяны, нявыразны ў сэнсе грамадзка-гаспадарчага і культурнага зьместу, якім думае запоўніць палітычную самастойнасьць Беларусі. Сяньня аб гэтым аб Тарашкевічы толькі тое ведаем, што ён здэцыдаваны вораг сучаснага капіталізму і што жадае бачыць у Беларусі нейкі новы грамадзкі лад. Мы ў гэтым можам яму толькі павіншаваць. Пры тым спадзяёмся так-жа, што далейшая няволя, размышленьні над лёсам свайго народу дапамогуць Тарашкевічу апрацаваць належна і выявіць таксама яго ідэолёгію грамадзкага ў Беларусі ладу, сапраўды карыснага як беларускаму народу, так і народам, у ёй жывучым.

Але гэтак гаварыць і думаць лёгка нам на свабодзе, а сусім нялёгка ў вастрозе і ў тых варунках маральных, у якіх знаходзіцца Тарашкевіч. Справа ў тым, што на яго асобу, усёроўна як на зайца, робяць паляваньне палякі і бальшавікі, з якіх кожны стараецца, каб здабыць яго сабе.

Польская санацыя, праз вусны аднаго з лідэраў сваіх п. М. Сьвяхоўскага („Kur. Wil." 24.II.33, art. „Akt II dramatu"), малюе Тарашкевіча, як таго, хто быццам працуе над беларуска-польскім збліжэньнем — бо ў вастрозе перакладае на бел. мову „Рапа Tadeusza" — і ўрэшце праз вусны таго-ж п. Сьвяхоўскага апэлюе да Суду, каб новы прысуд над Тарашкевічам не замкнуў дарогі да ўзаемнага зразуменьня і прабачэньня двух народаў: польскага і беларускага, дарогі, якую „swym czynem-symbolem z celi więziennej otworzył Br. Taraszkiewicz". Словам. паводле прыгожых слоў польскіх санатараў, Тарашкевіч гэта так-жа бяз мала санатар. Гэтак хораша „Kur. Wil." запяяў аб Тарашкевічу, каб на выпадак яго апраўданьня, прыгалубіць да сябе і ўзмоцніць безнадзейную слабасьць санатараў беларускіх. Суд аднак быў іншай думкі і Тарашкевіч павандраваў у вастрог узноў. Быць можа, што ён узноў незадоўга апынецца на волі, як гэта было раней, а чаго мы яму ад душы жадаем. Аднак мы праканаваны, што бяз увагі на тое, раней ці пазьней Тарашкевіч апынецца на свабодзе, ён будзе працаваць не над беларуска-польскім збліжэньнем, а прадусім над беларускім вызваленьнем.

Словам, мы верым, што Тарашкевіч на фронце польскім вытрывае, не сагнецца. Затое больш маем сумніваў, ці вытрывае ён на фронце савецкім? І на гэтым фронце так яма адбываецца фармальнае на Тарашкевіча паляваньне. Аб гэтым выразна сьведча савецкая прэса, як заграніцай(„Барацьба" ў Бэрліне), так і ўва ўсей СССР. Там Тарашкевіча так-жа бадай за свайго лічаць. Пагляд амі-ж сваімі соцыяльна-эканамічнымі і культурнымі ён да Саветаў сапраўды зблізаны, дык тым слабейшая яго там пазыцыя. Можа хутка надысьці вымена вязьняў між СССР і Польшчай і на вызваленьне са польскіх савецкіх якраз можа аказацца Тарашкевіч. Што тады? Астаецца

Заняпад сялянства і шляхі яго вызваленьня.

Гаспадарчы крызыс найбольш прыціснуў сялянства. Падупалі сялянскія гаспадаркі, упадае і поступ культурнага разьвіцьця сярод сялянства. Для сялянскіх дзяцей сярэдняя і вышэйшая школа сталася недаступнай. Польская школьная статыстыка даказвае, што ад часу, як пачаўся сучасны гаспадарчы крызыс, які наймацней прыціснуў сялянства і агулам земляробства, штораз зьмяншаецца прыплыў сялянскіх дзяцей да сярэдніх і вышэйшых школ.

Паводле гэнай статыстыкі ў 1927-28 школьным годзе на 10 тысяч жыхароў сялян, у сярэдніх і вышэйшых школах было ўжо тады толькі 21 вучань сялянскіх дзяцей, на 10 тысяч гандлёва-прамысловага элемэнту — 242 вучні гэных слаёў насельніцтва, а на 10 тысяч урадоўцаў — 519 вучняў.

Статыстыка гэная выразна гаворыць, які цяжкі доступ сялянству ў Польшчы да сярэдняй і вышэйшай асьветы. А трэба ведаць, што ў Польшчы сялянства становіць 80 процантаў усяго насельніцтва. Калі сяляне на 10 тысяч жыхароў могуць пасылаць у школу толькі 21 вучня, тады, калі гэткі лік гандляроў і прамыслоўцаў пасылае ў 10 разоў больш, а ўрадоўцы ў 20 разоў больш, дык ясным становіцца, што сялянства ў Польшчы да роўня культурнага з іншымі клясамі не даходзіць, але астаецца далёка з-заду і ў гэтым яго заняпад. Ня мае польскае сялянства паддастаткам сваёй інтэлігенцыі цяпер, няма надзеі, што будзе мець яе і ў будучыні: хто-ж тады належна пакіруе сялянскія масы ў барацьбе за свае жыцьцёвыя правы?

З гэтага відаць, што польскаму сялянству суджана ня скора выбіцца з-пад апекі шляхты і ўрадоўцаў.

Гэта лёс сялянства ў Польшчы агулам. У нас, у Зах. Беларусі, гэта справа выглядае зусім інакш: з аднаго боку яшчэ горш, а з другога боку можам пахваліцца — лепш.

Палажэньне беларускага сялянства пад Польшчай горшае ад палажэньня польскага сялянства ў тым, што мы беларусы амаль ня маем зусім сваей роднай школы, бо 2 казённыя філіяльныя гімназіі і са 2 дзесяткі нібы беларускіх, так-жа казённых пачатковых школ, на 2 з палавінай мільёнаў беларускага насельніцтва — гэта-ж капля ў моры і проста нічога. А польскае сялянства, калі ня мае доступу да сярэдняй і вышэйшай школы, дык мае сваю родную школу пачатковую.—Лепшае палажэньне беларускага сялянства ад палажэньня сялянства польскага ў тым, што нашае беларускае сялянства мае прад сабою вялікую будучыню, тады, калі польскае сялянства, пад павадырствам цяпер шляхты, работніцка-соцыялістычных

ў вастрозе — замнога гэроізму ды шкада сіл маладых. А ўзноў паехаўшы ў СССР нялёгка будзе, а можа нават і немагчыма ўтрымацца ідэова незалежным, астацца жывым сымбалем барацьбы за адраджэньне і самастойнасьць Беларусі.

Словам, прадусім ад таго, ці вытрымае Тарашкевіч незалежную беларускую лінію падчас далейшага свайго прабываньня ў вастрозе і тым больш, ці вытрымае ён гэтую лінію так ці йнакш апынуўшыся на свабодзе, **залежа лёс Тарашкевіча як павадыра свайго народу**, як праўдзівага барацьбіта за яго палітычную, соцыяльна-эканамічную і культурную незалежнасьць.

арганізацыяў ды align рознага роду ўрадаўцаў гэтай будучыні пакульшто прад сабою ня бачыць.

Беларускае сялянства — гэта фундамант Беларускага народу, на якім уся сапраўды беларуская інтэлігенцыя будуе Беларускі Дом. Дзеля гэтага сапраўды беларускі інтэлігент не паўстае і ня дзеіць проціў сялянства, апе стараецца, калі ня ведае, пазнаць яго патрэбы, пашыраць ідэю гэтых патрэб і ў канцы дамагаецца ўвядзеньня гэтых ідэалаў у жыцьцё. Калі мы заглянем у любую беларускую кніжку, дык нідзе, ні ў аднэй мы ня знойдзем ідэі соцыяльнай клясы заможнай, урадаўцаў, гандляроў, прамыслоўцаў, або нават і соцыялістычна-работніцкай, калі гэта кніжка сапраўды аўтора—Беларуса, а ўсюды гаворыцца ў справе соцыяльнай толькі аб сялянстве.

Словам, сярод беларусаў, асабліва у Зах. Беларусі, дзе амаль няма для беларускага сялянства роднай школы, як установы сыстэматычнага навучаньня, ёсьць школа, як сыстэма публічна-грамадзкай думкі, якая ўзгадоўвуе нашае сялянства ў народным і сялянскім дусе, паказваючы шлях да лепшай будучыні. Польскае сялянсгва ў польскім грамадзянстве займае мейсца іншае.

У Польшчы сялянства польскай інтэлігенцыяй разглядаецца, як кляса поруч з іншымі клясамі, а беларускае сялянства, ў беларускай народна-грамадзкай думцы, займае мейсца першае; бо беларускае сялянства ў Беларускім народзе гэта не кляса, а амаль увесь Беларускі народ.

Дзеля гэтага і шляхі барацьбы за лепшую долю для беларускага сялянства іншыя, а для польскага іншыя. Для беларускага сялянства шлях да лепшай долі праз поўнае народнае вызваленьне Беларускага народу, а для польскага — шлях барацьбы клясавай.

З вышэйсказанага ясна, што беларускаму сялянству не па дарозе ані з польскімі партыямі „хлопскімі“, ані з П. Пээсаўскімі дробнымі „рольнікамі“, а так-жа не па дарозе і з рознымі інтэрнацыянальнымі „радыкаламі“. Шлях і будучыня беларускага сялянства — гэта агульна народна - беларускае вызваленьне.

П—К.

Składčyna na tabaku, dy harełku heta dokaz ciemnaty; składčyna-ž na dobruju hazetu i knižku, heta pieršy krok da śviatła, dy papravy bytu.

Нам патрэбна школа працы.

Пад гэтакім загалоўкам беларуская коопэратыўна-гаспадарчая часопіс „Самапомач“ у № 2 (5) за м-ц люты с. г. зьмяшчае вельмі цікавую стацьцю, якую, прапускаючы сказы характару чыста фахова-коопэратыўнага, перадрукоўвуем тут цалком.

„Калі забіраем тут голас у справе „школы,“ дык маем наўвеце ня гэтулькі школу, як установу сыстэматычнага навучаньня, колькі кірунак і сыстэму публічна-грамадзкай думкі аб у з г а д а в а н ь н і чалавека да тых ці іншых заданьняў...

„Лішнім-бы было ўспамінаць тут, як крыўдна адбіваецца на нашым народзе векавое панаваньне раз тэй, другі раз іншай, але заўсяды чужой школы і культуры. Гэта школа ў істоце сваёй апіраецца на клясычным паглядзе на працу, як на нешта належнае для нявольнікаў, але няпрыстойнае для людзей „асьвячоных“, або для людзей з гэтак званай „вышэйшай сфэры.“ Гэты погляд на працу паходзіць з старапаганскіх Грэцыі і Рыму, гдзе праца сапраўды прызначалася нявольнікам, а „сьмятанка“ масава „займалася“ поэзіяй, вайной, а найчасьцей — пустой гутаркай, неакелзанымі гульнямі і звычайнымі разбоямі.

„Але для нас, беларусаў пад Польшчай, трагэдыя ў з г а д а в а н ь н я на гэтым ня канчыцца; для нас школа ёсьць чужой ня толькі паводле зьместу, але і паводле формы. У нас школа ад самага пачатку і аж да самага верху ёсьць нечым адарваным ад сапраўднага жыцьця, ад ягоных патрэбаў, а лектура школьная (чытаньне кніжак) не дае прыкладаў да насьлядаваньня Коласаўскіх ідэалістаў-змагароў, ані Купалаўскіх прарокаў, што вырасьлі з н а ш а й зямлі і для яе працуюць. І дзеля таго з сяньняшніх школ масава вяртаюцца людзі ня толькі няздольныя надаць пульс народнаму жыцьцю, але часта нямогучыя нават гэты пульс ухапіць. Гэта ўжо сапраўднае калецтва! Прыкладаў на гэта поўна ўсюды, а і наша рэдакцыя анагдай атрымала апісаньне аднэй саматугам арганізаванае гаспадарчае беларускае пляцоўкі, каторую аднак ня ўздолеў павясьці далей у школе выгадаваны інтэлігент. Якім жахам пранізываюць канцавыя словы гэтага апісаньня, калі аўтор ягоны, беларускі гаспадар, аўторытатыўна заяўляе, што **гультайская інтэлігенцыя ня можа працаваць.**“ Які страшны прысуд! — А што-ж гаварыць аб маладых „рэформатарах“, што самі не патрапіўшы йшчэ залажыць палец за палец, уважаюць сябе за ўпоўнамочаных да „крытыкі“ „дагэтуляшніх павадыроў“?

„Або, чаго варта сяньняшняя школа, калі яна ня здольна ўзгадаваць у чалавеку зразуменьня і энтузіязму для працы і а д к а з н а с ь ц і за яе? — Школа, замест гэтага, надзяляе сваіх гадунцоў няшчаснымі прывычкамі да ўсіх мяшчанскіх „выгодаў“, „здабыткаў цывілізацыі“ і ўсякага іншага марнатраўства, а паза школай на гэту-ж моладзь ад старэйшага пакаленьня ў нязьлічаных выпадках вее ўсёмарозячым незаслужаным „генэральствам,“ або гнільлём разкладнога фаталізму і нігілізму. — Ці-ж усё гэта магло каго прыгатаваць, запаліць да творчай працы наагул, а тымбольш—да працы грамадзкай? — Не! Сям-там-жа спатыканыя „дзельцы“ на ўласную руку, гэта не надзея наша, а няшчасьце!

„Дык дзе-ж выхад, дзе сіла, што патрапіла-б згальванізаваць, успружыць і пхнуць наша жыцьцё на пэўны тор гаспадарчае самабытнасьці?

„Мы цьвердзілі і цьвердзім, што выхад знаходзіцца ў коопэратыўнай самапомачы. Але і коопэрацыя ня ёсьць ані цудам, ані нейкім „добрым дзядзькам“: коопэрацыя гэта сума толькі згоднай, і ўмела пакіраванай супольнай людзкой працы, да каторай здольны чалавек, які зразумеў, што памагаючы бліжняму, сабе самому памагае. — Апрача карысьцяў матэрыяльных, коопэрацыя вучыць людзей грамадзкасьці, усьведамляе аб небясьпецы вызыску, будзіць духа бунту проці зла і несправядлівасьці, навучаючы адначасна перамагаць усе жыцьцёвыя труднасьці згоднай п р а ц а й у г р а м а д з е.“

Гэтулькі ў „Самапомачы“. Ад сябе ўважалі-б за канешнае з асаблівым націскам зазначыць важнасьць закранутага пытаньня **„буджэньня духа бунту проціў зла“.** Гэта зло, скуль-бы яно не паходзіла і як вялікае яно ня было б, — заўсяды будзе пераможана і выгнана, калі народ у масе сваёй усьвядоміцца аб тым **скуль гэта зло паходзіць і якую шкоду прыносіць.** Калі коопэрацыя заданьне гэта ў нас зможа выканаць, дык будучыня яе ў нас сапраўды першарадная. Бо ўзбудзіць і ў т р ы м а ц ь духа бунту проці зла, гэта значыць самое зло перамагчы. А гэтага нам усім вельмі трэба.

Я. Б.

Bližej da rodnych skarbaŭ.

Haspadarčy kryzys, što hetak kryŭdna adbiŭsia na ŭsim žyćci našaha kraju, pryastanaviŭ i naša biełaruskaje žyćcio kulturalnaje, što jasna vyjaviłasia miž inšym u źmienšańni našaha vydaviectva. Z druhoha ŭznoŭ boku tvory našych klasykaŭ, vydadzienyja drukam u lepšyja krychu časy, dla sučasnaha maładoha biełaruskaha pakaleńnia stalisia ŭžo amal niedastupnymi: raz što hetych vydańniaŭ u volnaj prodažy ŭžo ciažka, a časta i prosta niemahčyma dastać, a druhoje — usie hetyja vydańni drukavalisia pieravažna literami hraždanki, jakoj sučasnaja moładź, prajšoŭšy praz polskija školy, susiom nia znaje.

Voś-ža, pryjmajučy pad uvahu ŭsio heta, i chočačy ŭdastupnić šyrejšym kruhom našaj moładzi važniejšyja prynamsia adryŭki z tvoraŭ našych lepšych i najlepšych paetaŭ, Mižredakcyjnaja narada Vilenskich biełaruskich časopisiaŭ: „Bieł. Krynicy“, „Шляху Моладзі“, „Chryśc. Dumki“ i „Самапомачы“ pastanaviła vybrać karaciejšyja i lepšyja tvory našych klasykaŭ,—pieradusim tyja z ich, što ŭžo pałažany na noty,—pieradrukavać ich u siabie z časam łacinikaj i pastaracca vydać asobnaj adbitkaj.

Vykanaŭčaja Kamisija Mižredakcyjnaj narady.

Vilnia, luty 1933 h.

BIEŁARUSKIJA NACYJANALNYJA HYMNY.

I.

A chto tam idzie, a chto tam idzie?
U vahromnistaj takoj hramadzie?
— Biełarusy!
A što jany niasuć na chudych plačach,
Na u łapciach nahach, na u kryvi rukach?
— Svaju kryŭdu.
A kamu niasuć hetu kryŭdu ŭsiu,
A kudy niasuć na pakaz svaju?
— Na śviet cely.
A chto heta ich, nie adzin miljon,
Kryŭdu nieść naŭčyŭ, razbudziŭ ich son?
— Biada, hora.
A čaho-ž, čaho zachaciełaś jim,
Pahardžanym viek, im ślapym, hłuchim?
— Ludźmi zvacca!

(»Жалейка“ 38—39).

II.

Nie pahasnuć zorki ŭ niebie,
Poki nieba budzie,
Nie zahinie kraj zabrany,
Poki buduć ludzi.
Biełaruskaju rukoju
Svietłaj praŭdy siła
Słavu lepšuju napiša (2 razy)
Biełarusi miłaj.
Nočka ciomnaja na śviecie
Viečna nie panuje;
Ziernie, kinutaje ŭ nivu, (2 razy)
Uschodzie dy krasuje.
Zaćvicie naš kraj, jak sonca
Pośle niepahody,
Ŭ roŭnaj sile, ŭ roŭnym stanie (2 razy)
Miž ŭsich narodaŭ.
Naša ziernie — našy dumki —
Nie zahinuć śvietu, —
Blisnuć kraskaj niepablekłaj (2 razy)
Wiečnych ahniaćvietaŭ.
Z dobrych dumak, što my kiniem
Na svaim dzirvanie,
Budzie ŭnukam našym žniva
Dola, panavańnie.

(„Шляхам Жыцьця“ 146—147).

RODNY KRAJ.

(*Z paemy „Symon Muzyka“*).

O, kraj rodny, kraj pryhožy!
Miły kut maich dziadoŭ!
Što milej jość ŭ śviecie Božym
Hetych śvietłych bierahoŭ?!
Dzie brujacca srebram rečki,
Dzie lasy, bary huduć,
Dzie miadami pachnuć hrečki
Nivy hutarki viaduć!...
Hetych hmachaŭ biezhraničnych,
Bałatoŭ tvaich, vazior,
Dzie pad homan chval kryničnych
Dumki dumaje prastor;
Dzie uvosień płačuć łozy
Dzie ŭviasnu łuhi ćvituć,
Dzie šlachom starym biarozy
Adznačajuć hoža puć?...
Braćcia maje, biełarusy!
Ŭ hetaj knizie ludzkich spraŭ
Musić sam Boh dla pakusy
Hety kraj naš adznačaŭ.
Tut schadziliś ŭsie plamiony
Sporku siłaju kančać,
Kab bahata adarony
Miły kraj naš zvajavać...
I samych nas ŭziać ŭ niavolu,
Puty ździeku nałažyć,
Kinuć ŭ ciažkuju patolu,
Ab nas pamiać ŭsiu zamyć.
I na našych stanaviščach
Biliś Polšča i Litva,
Kab na hetych pažaryščach
Ŭzmacavałasia Maskva...
Ech, čaho nam nia pryšłosia,
Braćcia miłyja, užyć!
Kolki talentaŭ źviałosia
Kolki ich i dzie lažyć!...
Dyk chiba-ž my praŭ nia majem,
Šiły — šlach svoj adznačać,
I svaim ułasnym krajem
Kraj naš rodny nazyvać?

З беларускага жыцьця.

Ускрашэньне гуртка Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры. Увосені мін. году Пастаўскае старасты забараніла гуртку Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў в. Харках ня толькі разьвівацца ды пашыраць беларускую культуру, але і жыць, бо ўправу гэтага гуртка „завесіла“. Старшыня гэтага гуртка, ведамы беларускі народнік, грам. Я. Красоўскі, не згадзіўся з пастановай старасты і пачаў захады, пры помачы Цэнтралі Інстытуту, дзеля направы крыўды беларусам у Харках, каб „завешаны“ гурток ажывіць. Пачалася пісаніна і інтэрвэнцыі ў адносных уладаў. Прайшло некалькі месяцаў і гурток БІГіК у Харках ад „завешаньня“ ўдалося абараніць. Пастаўскае старасты „завешаны“ гурток Інстытуту „адвесіла“. Такім вось парадкам беларускую культурна-прасьветную пляцоўку ўдалося ажывіць пасьля „завешаньня“ яе адміністрацыйнай уладай.

Пасьля „адвешаньня“ старшыня Я. Красоўскі склікаў сход гуртка, які даканаў перавыбараў управы. — Новы ўрад гуртка цяпер гэткі: старшыня — Якім Красоўскі, сэкрэтар — Сьцяпан і Кейзік, скарбнік — Юльян Лапачонак, сябры: Знаіда Казаровіч і Зэнон Козаровіч.

Пасьля «адвешаньня» і абнаўленьня управы, гурток распачаў культурна-прасьветную працу. Дня 19.II. с. г. старшыня Красоўскі прачытаў папулярную лекцыю аб Беларусі і Беларусах. Народу на лекцыі было поўна. Зацікаўленьне вялікае.

Шкада змарнаванага «завешаньнем» дарагога, бо вольнага для сялянства зімовага, часу. Але што зробіш, калі беларусаў такі лёс, што польская адміністрацыя на іх патрэбы найменш зварочвае ўвагі: грунт сыскаць падаткі. Хіба-ж гэтак век ня будзе.

З дзейнасьці беларускага пасла ў польскім Сойме. Пасол Яраміч дня 13 і 14 лютага с. г. на агульным пасеєджаньні польскага Сойму сказаў дзьве прамовы: 1) падчас дыскусіі над бюджэтам і 2) падчас дыскусіі над самаўрадавым законам, вострa крытыкуючы адносіны польскіх уладаў да беларусаў, а такжа выяўляючы цяжкое сучаснае палажэньне беларускага народу пад Польшчай.

З выдавецкае нівы: „**Авадзень**“, гумарыстычны ілюстраваны двутыднёвік пачаў выходзіць. „Авадзень“ друкуецца гражданкай, № 1 выйшаў 25 лютага 1933 г. Рэдактар-выдавец А. Васілеўскі. Адрэс Рэдакцыі: Вільня, Замковая 17 кв. 7. Падпісная цана на «Авадня»: на год — 5 зл.; на паўгоду — 2.50; на тры месяцы — 1.25. За граніцу — ўдвая даражэй.

„Čamu ciapier ciažka žywiecca ziemlarobam“ А. Баброўскі, брашурка, Вільня 1933. Выдавецтва няведамае.

Лекцыя ў Т-ве Прыяцеляў Беларусаведы. У нядзелю 5 сакавіка а гадз. 17-ай у VII зале Унівэрсытэту адбудзецца VII навуковая зборка т-ва з лекцыяй грам. Хв. Ільяшэвіча на тэму: „Друкарня братоў Мамонічаў у Вільні“. Уваход вольны.

БЕЛАРУСЫ Ў ЛІТВЕ.

Агульны сход беларускай арганізацыі „Аб'еднаньне“. Дня 12 лютага с. г. адбыўся агульны сход беларускага студэнства Ковенскага Унівэрсытэту Вітаўта Вялікага, зарганізаванага ў „Аб'еднаньні“. Сход выбраў управу гэтай арганізацыі ў наступным складзе: старшыня — Д. Рудзь, віцэ старшыня — Г. Чэркас, скарбнік — А. Ус, сэкрэтар — А. Зэйгліш. У Рэвізыйную камісію выбраныя студэнты: Романэйко, Верабей і Малаток.

Новы аддзел Бел. Культурна-Прасьветнага Т-ва. У Вількамірскім вокрузе заснаваўся нядаўна новы аддзел Беларускага Культурна-Прасьветнага Т-ва.

„**Дзіцячы сад**“ **для беларускіх дзяцей у Коўне.** Дня 19 лютага с. г. адбылося ўрачыстае адкрыцьцё „Дзіцячага саду“ для беларускіх дзяцей у Коўне.

Беларускае прадстаўленьне ў Шырвінтах. Бразільскі аддзел Бел. Культ.-Прасьвет. Т-ва дня 22 студзеня с. г. зладзіў у Шырвінтах беларускае прадстаўленьне. Адыграны: — „Зьбянтэжаны Саўка“ і „Пасланец“. Пасьля прадстаўленьня былі дэклямаваны беларускія вершы.

Да справы Беларускага Цэнтру ў Літве.

Беларусы ў Літве, як бачым з газэтных вестак, заварушыліся. Як можна судзіць з газэт, пачалася там значная культурна-прасьветная праца, якую вядзе Беларускае Культурна-Прасьветнае Таварыства ў Літве. Бяда толькі ў тым, што Таварыства не змагло аб'яднаць усіх у Літве беларусаў і стацца беларускім цэнтрам. Да стварэньня гэткага цэнтру прыступіла другая бел. група, якая не належа да Культ-Прасьвет. Т-ва. Трудна аднак паверыць, каб аднэй якой групе ды ўдалося стварыць цэнтр. Сапраўды беларускі цэнтр могуць стварыць усе аб'яднаныя **беларусы.** Чужы элемэнт на чале з Боевым, ведама, да аб'яднаньня не паможа. Ад далейшых уваг на гэту тэму покульшто ўстрымліваемся. На заканчэньне выражаем толькі гарачае пажаданьне, каб у Нез. Літве паўстаў урэшце **сапраўдны беларускі цэнтр,** які-б усіх беларусаў згуртаваў і аб'яднаў для агульна-беларускага дабра.

Я. П.

Літоўскі голас у Лізе Народаў.

25 лютага сёл. г. ў Жэнэве на сэсіі Лігі Народаў, на якой было прынята рашэньне ў справе японска-кітайскага спору, забраў так-жа голас літоўскі міністр заграгічных спраў др. Заунюс. Мова яго зрабіла вялікае ўражаньне. Літоўскі міністр прадусім падчыркнуў, што стварaецца небясьпечнае палажэньне: калі Ліга Народаў, замест прыняць у якой справе аканчальнае рашэньне і выканаць яго, яна звычайна агранічваецца да рашэньня палавічнага. Др. Заўнюс за прыклад узяў справу віленскую, калі пасьля разважаньня яе Ліга Народаў край гэты пакінула за Польшчай, з крыўдай для Літвы і гэтым самым адкрыла дарогу да паўстаньня ў будучыні новых непаразуменьняў і забурэньняў. Трэба абавязкава ўзяцца за рашучыя спосабы — заявіў літоўскі міністр — каб уцьвярдзіць супакой як на ўсходзе, так і на захадзе Эўропы. Трэба абавязкава, каб Ліга Народаў, прымаючы тыя ці іншыя рэзалюцыі, не адказвалася так-жа й ад свайго больш рашучага права што да паўстаўшага якога спору. Ліга Народаў не павінна паддаваць палажэньню, створанаму сілай, як гэта яна звычайна паступае, а павінна ўжыць усіх магчымых ёй спосабаў, каб запанавала між народамі ня сіла, а справядлівасьць і права.

М. К.

З Польшчы.

З Сэнату. Пасьля правядзеньня праз Сойм дзяржаўнага бюджэту, закону аб самаўрадах і ўнівэрсытэтах, узяўся ўжо іх разглядаць Сэнат. Ня трэба спадзявацца, што Сэнат штосьці там зьменіць, а трэба спадзявацца, што ўсё будзе пацьверджана, бо таксама і ў Сэнаце, як і ў Сойме цяпер большасьць урадавага Б.Б.

Нутраная пазычка. Мы ўжо пісалі, што ўрад, каб латаць дзюры бюджэту, мае распісаць нутраную пазычку. Але ці гэта ўдасца, спадзявацца трудна, бо насельніцтва Польшчы, асабліва сялянства, за душой ня мае і граша. Ёсьць людзі, што маюць грошы, але яны свае капіталы хаваюць у заграгічных банках. Яны хоць і ўдаюць дзяржаўнікаў польскіх, але кішэнь сваю хаваюць лепш у Францыі, Швайцарыі, Галяндыі, дзе яны больш пэўны, што ня згіне.

Дзяржаўны дэфіцыт за месяц студзень 1933 г. Паводле ўрадавай статыстыкі ў месяцы студзені с. г. дзяржаўны скарб меў даходаў 156 мільёнаў зл., а расходаў 180 мільёнаў зл. Такім чынам м-ц студзень даў польскаму скарбу 24 мільёны зл. дэфіцыту.

Прывоз з заграніцы ў Польшч земляробскіх і інш. прадуктаў. Не зважаючы, што ў Польшчы на рынках няма добрага збыту для краёвых земляробскіх прадуктаў, гэтыя-ж прадукты прывозяцца на польскі рынак і з заграніцы. За адзін м-ц студзень с. г. прывезена з заграніцы ў Польшчу: пшаніцы—на 991 тысячу зл., жыта — на 317 тысяч зл., рыжу — на 739 тысяч зл., сырых скур — на 1 мільён 172 тысячы зл., алейнага насеньня—на 2 мільёны 347 тысяч зл., тлушчаў — на 988 тысяч зл. Гэнае вылічэньне падае ўрадавая статыстыка — „Wiadomości Statystyczne“.

Вось як паддзержываецца краёвае земляробства. Селянін, дзе хоча і як хоча, няхай прадае свае прадукты, але падаткі плаціць мусіць.

Сэквэстратары і аддзел паліцыі з кулямётам і бомбамі па падаткі. У Сойме падана інтэрпэляцыя да ўраду ў справе забурэньняў у в. Белявы, Варшаўскага пав., дзе на сьцягіваньне падатку з сялян сэквэстратары прыбылі з атрадам паліцыі, кулямётам і бомбамі. У выніку гэтага, як падае інтэрпэляцыя, шмат арыштавана сялян.

Вороноўская апэрацыя ў Варшаве. Газэты падаюць, што ў Варшаве скора адбудзецца „вороноўская“ апэрацыя, якая палягае на тым, што старога дзеда быццам адмаладжвае на пару дзесяткаў гадоў і тады такі дзед можа жаніцца і жыць з маладой жонкай. Тыя-ж газэты пішуць, што дзеля гэтай апэрацыі прывезена ўжо малпа-горыла, якая сваю „моладасьць“ будзе мусіць перадаць дзеду. — Але хто гэты дзед? (Прыпісак друкара).

Студэнскія дэманстрацыі ў Варшаве. У абароне ўнівэрсытэцкай аўтономіі ў Варшаве амаль што дзень дэманструюць студэнты.

З заграніцы.

Напружаньне ў міжнароднай палітыцы. Апошнімі часамі ў міжнароднай палітыцы заўважаецца вялікае напружаньне, якое родзіць небясьпеку вайны і творыць ваенныя блёкі дзяржаў: з аднаго боку — дзеля ўтрыманьня сучасных дзяржаўных граніц, а з другога — дзеля іх зьмены.

Між дзяржавамі Малой Антанты: Чэхаславаччынай, Югаславіяй і Румыніяй заключаны дагавор, паводле якога гэтыя дзяржавы маюць выступаць на міжнароднай арэне, як адна арганізацыя. Гэнае аб'еднаньне раўняецца канфэдэрацыі і зьяўляецца на міжнароднай арэне як-бы новая дзяржава з 40 мільёнаў насельніцтвам.

Мэта гэтага блёку дзяржаў — самаабарона і ўтрыманьне сучаснага ў Эўропе тэрыторыяльнага палажэньня дзяржаў.

Дагавор Малой Антанты сьціраваны выразна процiў тайнага дагавору між Італіяй, Нямеччынай і Вугрыяй.

Поруч з гэтымі блёкамі, між Францыяй і СССР. пачаўся палітычны флірт дзеля зьбліжэньня, каб прыцягнуць СССР. на бок прыхільнікаў Вэрсальскага трактату.

Паўстаньне блёку Малой Антанты, тайны дагавор між Італіяй, Нямеччынай і Вугрыяй, а між імі флірт Францыі з Саветамі нарабілі ў эўрапэйскай палітыцы многа шуму і давялі яе да вялікага напружаньня.

Выступленьне Японіі з Лігі Народаў. Апошнімі часамі Японія выступіла з Лігі Народаў, бо Ліга ў канцы не згадзілася патаківаць японцам у справе заваёўваньня ёй кітайскіх земляў.

Японска-кітайская вайна. Японія з Кітаем ваюе ўжо больш году часу. Але гэта вайна дагэтуль уважалася неафіцыяльнай: эўрапэйскія палітыкі называлі яе: адны — бунтам паасобных генэралаў, іншыя —ўсьмірэньнем кітайскіх „бандытаў“, пасьля— паўстаньнем у Манджурыі процiў кітайцаў, у канцы—фармаваньнем новай манджурскай дзяржавы пад апекай Японіі і г. д., пакуль Японія не залезла ў Кітай так далёка, што сталася пагрозай там і інтарэсам эўрапэйскім і амэрыканскім. Ліга Народаў пасылала туды ў Кітайшчыну сваю камісію, якая глядзела, пераглядалася на гэту вайну і ў канцы ўгледзіла, што з японцамі няма чаго жартаваць, бо яны не пагладзяць па галоўцы там у Кітайшчыне і эўрапэйскія, а таксама і амэрыканскія інтарэсы.

Вось-жа апошнімі часамі Ліга Народаў, разгледзіўшы рапарты сваей камісіі аб японска-кітайскай вайне, перастала патаківаць Японіі і станула быццам у абароне Кітайцаў. З гэтай пары ўжо японска-кітайская вайна называецца вайной афіцыяльнай. Баі там вядуцца такія самыя, як і прад гэтым, але прад гэтым у Эўропе называлі іх бунтам або ўсьмірэньнем бунту, а цяпер—вайной.

Прадвыбарная кампанія ў Нямеччыне, якая дайшла ўжо да найбольшага напружань-

ня, зарысавалася крывавымі падзеямі. На мітынгах і прадвыбарных сабраньнях даходзіць да крывавых сутычак —страляніны, дзе бываюць раненыя і забітыя.

Пажар у Рэйхстагу. Дня 27 лютага загарэўся палац нямецкага парляманту—Рэйхстагу. Сьледзтва выявіла, што Рэйхстаг падпалены ў 20—30 мяйсцох камуністамі. Паліцыя арыштавала западозранага ў падпале чалавека, які да віны прызнаўся і заявіў, што ён належыць да галяндзкай камуністычнай партыі. Дзеля гэтага спадзяюцца жорсткіх рэпрэсіяў процiў камуністаў ва ўсёй Нямеччыне.

Паводле апошніх вестак цэлы рад камуністычных паслоў Рэйхстагу было ўжо арыштавана.

Камуністы шукаюць вінаватых за свае памылкі ў земляробстве у СССР. На агульным зьезьдзе прадстаўнікоў камуністычнай партыі Украіны, камуніст Косёр (паляк) сказаў вялікую прамову, у якой заявіў, што клясавы вораг,які тармозіць разьвіцьцё колектыўнага гаспадарства, знаходзіцца ў колектывах. Косёр даказваў, што ў калгасах крадуць збожжа і ўсё што папала. Пры гэтым, калгасьнікі нясумленна працуюць, а дзеля гэтага з кожным годам ураджай у калгасах зьмяншаецца. Камуніст Косёр радзіць выкараняць гэнае зло рэпрэсіямі.

На наш пагляд вінават тут не „клясавы вораг," але сама сыстэма камуністычнай гаспадаркі.

Банкроцтва Форда. Ведамыя вялізарныя фабрыкі аўтамабіляў амэрыканскага прамыслоўца Форда апошнімі часамі збанкрутавалі. Банкроцтва Форда пацягнула за сабой банкроцтва многа вялікіх банкаў, якія былі зьвязаны з прамысловасьцяй Форда. Гэнае банкроцтва зрабіла вялікі чарговы ўдар па амэрыканскім промысьле.

З краю

Напад ваўкоў. Надоечы каля Казлоўшчыны ў Навагрaдчыне стада ваўкоў напала на праяжджаючага купца, які вёў пры возе 2 коняў. Купец пакінуў воз і коняў, а сам уцёк у вёску. Ваўкі за чалавекам ня гналіся, але напалі на коняў. З вёскі сяляне з віламі, цапамі ды сякерамі пабеглі з купцом у лес, але ваўкоў ужо там ня было, а толькі кроў і недаедкі конскага мяса. Ваўкі за паўгадзіны часу зьелі 3 коняў.

Аблава на ваўкоў і ваўка на чалавека. Надоячы у Маладэчанскім і Валожынскім пав. адбылася аблава на ваўкоў. Падчас аблавы 2 ваўкі напалі на чалавека-заганяча, павалілі і пачалі грызьці. На ратунак чалавека прыбылі сабакі, ад якіх ваўкі пачалі ўцякаць. Чалавека параненага адвезьлі ў шпіталь. Падчас аблавы забіта некалькі штук ваўкоў.

Трагічнае самагубства жанчыны. У вёс. Уздово, Міхалоўскай гм. гадоў 4 ляжала абложна хворай маладая жанчына, Міхаліна Такашова. Дактары хворай не маглі даць ніякае рады. Такашова пастанавіла палажыць на сябе рукі.

Хворая, сама ня могучы ўстаць, папрасіла 7-гадовага сына Казючка, каб прывязаў вяроўку за клямку дзьвярэй, а другі канец каб засмаргнуў ёй за шыю, тлумачачы сынку, што ад гэтага скора паздаравее. Хлопчык ахвотна просьбу маткі споўніў і чакаў яе аздараўленьня. Уваходзячы ў хату муж Токашовай пацягнуў за клямку дзьвярэй і гэтакім спосабам Токашова павесілася. Пакуль муж пасьпеў адвязаць вяроўку, жонка была ніжывая.

На вясельлі труп і арышты. У Куранецкай гм. Вялейскага пав. на вясельлі хлопцы так „падгулялі," што ў выніку дзікай гульні аказаўся адзін забіты, два моцна пабіты, а здаравейшыя—арыштаванымі.

Сапраўды дзікая яшчэ падчас бывае наша моладзь. Няхай гэны сумны выпадак будзе прасьцярогай для другіх.

Сьвіні ў СССР. З Польшчы выехала купецкая дэлегацыя ў Маскву, каб дагаварыцца аб вывазе з Польшчы сьвіней у СССР. З Віленшчыны сьвіні ў СССР. ня пойдуць, бо, як падаюць газэты, тут няма адпаведных бойняў, якія-б прыгатавалі на вываз сьвініну.

Да нас пішуць

ЛЕКЦЫЯ І СКОКІ.

З Навагрaдзкага беларускага жыцьця. 25.II. с. г. ў залі беларускай філіі дзяржаўнай гімназіі ў Навагрaдку была наладжаная вучнямі VII клясы ўрачыстая акадэмія, пасьвячаная памяці Фр.Багушэвіча (?—*рэд.*),з каторай даход празначаны на карысьць незаможных вучняў гімназіі. На праграму акадэміі зляжыўся: 1) старанна апрацаваны рэфэрат аб творчасьці Багушэвіча, прачытаны Пляскачом — вучням VII клясы, 2) дэклямацыя вершаў Багушэвіча і 3) беларускія народныя песьні ў выкананьні школьнага хору і аркестры пад кіраўніцтвам грам. А. Валынчыка — вучыцеля гімназіі. На акадэміі былі прысутныя вучні польскай гімназіі і некалькі асобаў з мяйсцовага грамадзянства. Пасьля акадэміі адбыліся скокі.

Пры гэтым трэба адзначыць, што акадэмія выпала-б шмат лепш, каб некаторыя з беларускіх вучняў аднесьліся сур'ёзней да ўрачыстасьці, бо, нажаль, далося заўважыць з іх боку лёгкаважаньне акадэміі, каторую лічылі за нейкі маленькі, непатрэбны ўступ да танцаў. Ані культуртрэгерскія танцы, ані размовы і ненатуральныя воплескі ў часе акадэміі ў жадным разе да добрай, сапраўднай рэпрэзэнтацыі беларускай культуры ня прычыніліся. Трэба памятаць, што як сам сябе шануеш, гэтак будуць цябе шанаваць і другія.

Прысутны.

ВЫЯСЬНЕНЬНЕ.

Баранавічы. У прошлым нумары „Бел. Крыніцы" надрукавана была карэспандэнцыя „Баранавіцкага", у якой ён падае, што ў Баранавічах, у праваслаўным саборы, раскідваецца „Беларуская Крыніца" і „Самапомач". Справа гэта ня так дрэнна выглядае, як апісаў „Баранавіцкі". У сапраўднасьці выглядае яна вось так:

Некалькі месяцаў таму, пры Баранавіцкім праваслаўным саборы заснавана бібліятэка. Кніжкі і газэты ў гэтую бібліятэку паступаюць з ахвяр. Вызначаны адпаведны чалавек, які гэтыя кніжкі і газэты забірае і выдае чытачом. У царкве знаходзіцца „брацкі" стол, на які раскладаюцца газэты і кніжкі, дзе даступна кожнаму ўзяць газэту або кніжку для чытаньня, з абавязкам пасьля палажыць яе на мейсца. Аб гэтым усім і аб такім парадку бібліятэкі „брацкага стала" мітро-протоерэй Павал абвесьціў афіцыяльна ў Царкве. У гэную-ж бібліятэчку прыносяць людзі і ўспамянутыя часопісі: „Б. Крыніцу" і „Самапомач", якія заўсяды знаходзяцца сусём легальна на „брацкім" століку ў царкве. З гэтага століку людзі бяруць часопісі, чытаюць і пасьля адносяць іх.

Добры гэта спосаб пашыраньня добрага друкаванага слова, але, як відаць, ня зусім добра некаторымі адзінкамі зразумелы. Дык раджу тым, хто гэтага не зразумеў, хай папытаюцца аб гэтым у бібліятэкара гэтай бібліятэчкі, якога сьвяшчэньнік публічна ў царкве ўсім прадставіў.

Пры гэтым цьверджу, што „Бел. Крыніца" і „Самапомач" не валяюцца ў царкве, як гэта піша „Баранавіцкі", а знаходзяцца ў царкве на належным мейсцы — на стале „брацкай бібліятэчкі".

Ш. Ів.

Гутарка Дзядзькі Гаўрылы.

Цяпер хачу зьвярнуць увагу нашай моладзі на адну рэч. Як ведама польскія ксяндзы Заходняй Беларусі закладаюць „Стowaжышэне млодзежы польскей," а польскія чыноўнікі—„Стшэльца". Кожны сьведамы малады Беларус ведае мэту гэтых арганізацыяў: імкнуцца яны да таго, каб сполёнізаваць нашу моладзь, вырваць нашай моладзі пачуцьцё да свайго роднага— беларускага. Аднак, калі бліжэй прыглядзіцца, дык убачыць можна, што па-за мэтай полёнізацыі, уводзяць яны і нязгоду паміж нашай моладзяй. Гэтую нязгоду сеюць паміж моладзяй самі паводыры гэтых чужых нам польскіх арганізацыяў. І ня дзіва, што разагітаваныя гэтакім спосабам сябры праціўных сабе двух арганізацыяў, калі спаткаюцца, хоць знаёмыя добра, ня вітаюцца. Паводыры аднак паступаюць інакш. Калі паводыр „Стшэльца" спатыкае паводыра „С. м. п.", дык ветліва прывітаюцца, сьціснуўшы сабе рукі. Або якая вечарынка на запросінах, дык там бавяцца ўсе і паводыр „Стшэльца", і „С. м. п." і інш., насьмейваючыся з неразумных паступкаў нашай моладзі. Там, у іх, „ў гарэ",— бяседа, кялішак, прызьнаньне, сьціскаваньне рук на знак згоды, а паміж моладзяй „у нізе" — злосьць, кіі ў руках, злосны язык і лаянка. Моладзь, каторая не належа да польскіх арганізацыяў, таксама злосна адносіцца да тых, каторыя належаць да арганізацыяў польскіх.

Даражэнькая моладзь! Зварачываюся да Вас усіх: кіньце між сабою лаянку і злосьць, а жывеце дружна. Хай ворагі Вашы не сьмяюцца з Вас. Вы маладыя, каторыя яшчэ не даліся апутацца польскім арганізацыям, кіньце гневацца на „Стowaжышэнцаў" і „Стшэльцаў" і даруйце ім іх пастункі, бо іх пастункі нясьведамыя і прыстасуйце да іх словы: „Божа, адпусьці ім, бо ня ведаюць, што робяць". І з гэтымі славамі на вуснах, з братэрскаю міласьцю ў сэрцы, усьвядамляйце і наварачывайце зблудзіўшых з дарогі фалшывай на добрую. І Вы „Стowaжышэнцы" і „Стшэльцы," што заблудзілі, як авечкі, папаўшы не ў сваю абору, вярнецеся адтуль і ў згодзе з рэштай моладзі працуйце на карысьць сваю і сваей Бацькаўшчыны, закладаючы гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, або Таварыства Беларускае Школы.

Дык у добры час да працы!

Дзядзька Гаўрыла.

Гутарка Дзядзькі Сьцяпана.

Чытаючы Гутаркі Дзядзькі Гаўрылы, а перадусім апошнюю, з дня 12 лютага с. году, прышла ў маю старую галаву думка, напісаць і сваю гутарку.—Як ведама, у вёсках ёсьць такі звычай, пераважна ў малодшых дзяўчат, а часта і ў старых бабуляк, абгаварываць адна адну, а інaчай сказаўшы „вадзіць плёткі". Вось-жа гэтыя „плёткі" прыводзяць часта да ўзаемных лаянкаў. а што горшае — і да бойкаў (гэткія рэчы ў дзяўчат здараюцца радзей). Мушу з сумам прызнаць, што і ў нашай вёсцы ёсьць такія „прыяцелькі," што нібы жывуць і ў згодзе, аднак у душы ўсё носяць нейкую злосьць ці пагарду.

Калі зьбяруцца да аднэй хаты, то і зачынаюць абгаварываць адна адну, або дальшых знаёмых.Адным словам: увесь сьвет ёсьць дрэнны, толькі яна адна добрая і справядлівая. А як пагодзяцца паміж сабою, усе засядаюць за стол і пачынаецца забава — ў карты.

Вось як праводзяць зімовыя вечары нашы вясковыя дзяўчаты, замест чытаць прыгожыя кніжкі ці газэты, як радзіць нам Дзядзька Гаўрыла. А калі зайшоў я апошняй нядзелі у хату, дзе адбывалася гэта „ігра у карты" і пачаў гэных грачкаў „кантаваць," прыганяючы іх да кніжак і газэт, то яны, ня ведаючы як сказаць, назвалі мяне „панам." Цiж толькі паны павінны чытаць, а мы не? Я скажу, што мы сяляне— беларусы павінны болей чытаць ад паноў, бо паны і так усе прасьвечаныя і зарганізаваныя; а мы, сяляне, апроч „свайго носа" нічога не відзім, а што горшае — і відзець ня хочам. Вы маладыя дзяўчаткі вазьмеце ў рукі ў вольны час лепш кніжку або газэту, чым карты і наварачывайце тых, што зышлі на бездарожжа! Гутарце заўсяды гутаркай беларускай, а прасьвячайце тых, што „ламаюць польшч". — Як дзяўчаткі нашы пачнуць гэтак рабіць, застыдаюцца і мальцы. І гэткім спосабам пачне разьвівацца пасярод моладзі прасьвета, пашырыцца родная кніжка, а гэтым самым і пачуцьцё беларускасьці. Пажадаю Вам, мілыя дзяўчаткі, плоднай працы на полі культурна-прасьветным.

Дзядзька Сьцяпан.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.